# «ЛІТАРАТУРНАЯ СПАДЧЫНА УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА»

**(к 95-годдзю з дня нараджэння пісьменніка, публіцыста, драматурга, сцэнарыста Уладзіміра Сямёнавіча Караткевіча)**





(1930-1984)

**Уладзімір Сямёнавіч Караткевіч — беларускі паэт, празаік, драматург, публіцыст, перакладчык, сцэнарыст, класік беларускай літаратуры. Адна з найбольш вядомых постацей у беларускай літаратуры другой паловы XX стагоддзя. Першы беларускі пісьменнік, які звярнуўся да жанру гістарычнага дэтэктыву.**

# БІЯГРАФІЯ І ТВОРЧАСЦЬ У.С. КАРАТКЕВІЧА



Уладзімір Караткевіч нарадзіўся 26 лістапада 1930 года ў горадзе Орша Віцебскай вобласці ў сям'і бухгалтара. Падчас Вялікай Айчыннай вайны з сям'ёй знаходзіўся ў эвакуацыі ў Пермскай вобласці, пазней у Арэнбургe. У 1944 годзе вярнуўся ў Оршу, дзе і атрымаў сярэднюю адукацыю. У 1949-1954 гадах вучыўся на філалагічным факультэце Кіеўскага дзяржаўнага ўніверсітэта. Затым у ім жа скончыў аспірантуру.



Працаваў настаўнікам у сельскай школе ў Кіеўскай вобласці Украіны, а затым у родным горадзе. Пазней вучыўся на Вышэйшых літаратурных курсах (1960) і інстытуце кінематаграфіі (цяпер Расійскі дзяржаўны інстытут кінематаграфіі ім. С. А. Герасімава).










Першыя вершы апублікаваў у 1951 г. у аршанскай раённай газеце «Ленінскі прызыў». У 1955 г. верш «Машэка» быў змешчаны ў часопісе «Полымя». Выйшлі зборнікі паэзіі «Матчына душа», «Вячэрнія ветразі», «Мая Іліяда», «Быў. Ёсць. Буду».

Аўтар зборнікаў апавяданняў і аповесцей «Блакіт і золата дня», «Вока тайфуна», «З вякоў мінулых», раманаў «Каласы пад сярпом тваім», «Хрыстос прызямліўся ў Гародні», аповесці «У снягах драмае вясна» і інш. Для дзяцей выдаў «Казкі» і нарыс «Белавежская пушча».



Аўтар п'ес «Млын на Сініх Вірах», «Званы Віцебска», «Кастусь Каліноўскі», «Калыска чатырох чараўніц», «Маці ўрагану». У 1988 г. выйшаў зборнік п'ес «Старыя беларускія хронікі». Напісаў сцэнарыі кароткаметражных і поўнаметражных фільмаў «Сведкі вечнасці», «Памяць каменя», «Будзь шчаслівай, рака», сцэнарыі мастацкіх фільмаў «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» (першапачатковая назва «Жыцціе і ўзнясенне Юрася Братчыка»), «Чырвоны агат», «Дзікае паляванне караля Стаха», «Чорны замак Альшанскі». На тэлебачанні і радыё па яго творах пастаўлены шэраг спектакляў.















**Выступаў як публіцыст і крытык. Напісаў нарыс «Зямля пад белымі крыламі» (першае выданне - на ўкраінскай мове), эсэ «Мсціслаў – Мстиславль», артыкулы пра мых беларускіх, украінскіх пісьменнікаў. З 1987 па 1991 гг. выйшлі Выбраныя творы ў 2 тамах і Збор твораў у 8 тамах.**

**Працаваў як перакладчык. На беларускую мову пераклаў драму М. Карыма «У ноч зацьмення Месяца» (пастаўлена ў 1972), аповесць Э. Гашпаравай «Цяжка быць мустангам», асобныя творы Дж. Байрана, А. Міцкевіча, І. Франка, Я. Судрабкална, Б. Мацкявічуса і інш.**

**Уладзімір Караткевіч — Кавалер ордэна Дружбы народаў, лаўрэат Літаратурнай прэміі СП БССР імя І. Мележа за раман «Нельга забыць» («Леаніды не вернуцца да Зямлі»), Дзяржаўнай прэміі БССР імя Якуба Коласа (пасмяротна) за раман «Чорны замак Альшанскі».**








Ён бліскуча рэалізаваў сябе ў самых разнастайных літаратурных і мастацкіх формах: ад паэзіі і мастацкай прозы да публіцыстыкі, крытыкі, дзіцячай літаратуры, перакладчыцкай справы і драматургіі для тэатра, оперы і кіно. Яго творчасць адрозніваюць рамантычны дух, высокая мастацкая культура, патрыятызм і гуманізм. Пісьменнік істотна ўзбагаціў беларускую літаратуру, пашырыўшы яе тэматычныя і жанравыя рамкі і надаўшы ёй глыбокі інтэлектуальны і філасофскі змест.

# КНІГІ У.С. КАРАТКЕВІЧА Ў БІБЛІЯТЭЦЫ ІМ. Д.Р. НОВІКАВА




**928**
**К 215 ж. і.**
**Караткевіч, У. С.**
**Жыццё і ўзнясенне Уладзіміра Караткевіча : партрэт пісьменніка і чалавека / У. С. Караткевіч, А. І. Мальдзіс. – Мінск : Літаратура і мастацтва, 2010. – 207 с.**

**Уладзімір Караткевіч, легендарны беларускі раманцік, апярэджваў свой час, узняўся над канфармізмам, над паўсядзённасцю і бездухоўнасцю да вышыняў, з якіх добра відаць шляхі, што лучаць мінулае з будучыняй, чалавека з людзьмі і народамі.**




**928**
**К 215 у. к.**
**Караткевіч, У. С.**
**Уладзімір Караткевіч: вядомы і невядомы : зборнік эсэ, вершаў, прысвячэнняў / У. С. Караткевіч ; уклад.: А. Верабей, М. Мінзер, С. Панізнік. - Мінск : Літаратура і мастацтва, 2010. – 365 с.**

**Адметнасць і непаўторнасць новай кнігі пра Уладзіміра Караткевіча заключаюцца найперш у тым, што яна нечым нагадвае сяброўскую сагу пра вялікага і легендарнага пісьменніка, пра чалавека, чые ўплывы на грамадскую думку, на фарміраванне гістарычнага светапогляду сучасніка працягваюцца і цяпер.**




**К 215 з. т. / 1**
**Караткевіч, У. С.**
**Збор твораў : у васьмі тамах / У. С. Караткевіч ; рэд. Андраюк [і інш.]. – Мінск : Мастацкая літ...**
**Т. 1 : Вершы, паэмы / рэд. С. А. Барадулін ; уклад. і аўт. каментарыя А. Л. Верабей. – 1987. – 431 с.**

**У першы том уваходзяць вершы і паэмы Уладзіміра Караткевіча (1930-1984 гг.), якія напісаны ім на працягу ўсей яго літаратурнай дзейнасці. Яго паэзія вызначаецца рамантычнай узнесласцю і грамадзянскай страснасцю, смелай вобразнасцю і глыбіней зместу, пранікненым лірызмам і філасафічнасцю, патрыятычным гучаннем і гуманістычнай скіраванасцю.**




**К 215 б.і.**
**Караткевіч, У. С.**
**Блакіта і золата дня : апавяданні і аповесці / У. С. Караткевіч. – Мінск : Дзяржаўнае выдавецтва БССР, Рэдакцыя мастацкай літаратуры, 1961. – 224 с.**

**Паэт Уладзімір Караткевіч упершыню выступае з кнігай прозы. Апавяданні яго прысвечаны ў асноўным жыццю нашага маладога пакалення, яго радасцям і перамогам, працы і каханню, пранікнуты нянавісцю да вайны. Аўтар пераканаўча піша аб тым, што яго больш за ўсё хвалюе: пра мастацтва, пра тонкія зрухі чалавечай душы, пра чалавечую чысціню і палкасць, гуманізм, пра чароўную прыроду Беларусі.**




**К 215 б.ё.**
**Караткевіч, У. С.**
**Быў. Есць. Буду. : кніга паэзіі / У. С. Караткевіч. – Мінск : Мастацкая літ., 1986. – 174 с.**

**Гэта кніга паэзіі Уладзіміра Караткевіча (1930-1984), якую ён падрыхтаваў да друку, сам вычытаў машынапіс. Аўтар не пабачыць кнігі, але ўдзячны чытач сустрэнецца зноў выдатным майстарам, па-класічнаму мудрым, па-юначы дзёрзкім, адным з самых дасведчаных пісьменнікаў нашага часу - з Паэтам Улдзімірам Караткевічам.**




**К 215 н.з.**
**Караткевіч, У. С.**
**Нельга забыць : раман / У. С. Караткевіч. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1982. – 335 с.**

**Раман прысвечаны жыццю творчай інтэлігенцыі. Аўтар падае сучасныя падзеі на гістарычным фоне. Праўнук беларуса Усяслава Грынкевіча, удзельніка паўстання 1863 года, сустрэў Ірыну Гораву, праўнучка рускага афіцэра Юрыя Горава, і пакахаў яе. Раман «Нельга забыць» вядомы таксама і над назваю «Леаніды не вернуцца да Зямлі».**




**К 215 т.**

**Караткевіч, У. С.**

**Творы : проза, драматургія, публіцыстыка / У. С. Караткевіч ; рэд. тома Р. І. Барадулін ; рэд. С. А. Андраюк [и др.]. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1996. – 561 с.**

**Гэта фактычна дзевяты том Збору твораў класіка беларускай літаратуры Уладзіміра Караткевіча. Аповесць «У снягах драмае вясна», апавяданні, легенды, публіцыстыка, два разделы з другой кнігі рамана «Каласы пад сярпом тваім» склалі цікавы і патрэбны кожнаму, хто любіць усе беларускае, том шматграннага талентам пісьменніка.**




**К 215 ч.**
**Караткевіч, У. С.**
**Чазенія : аповесць, п'еса, апавяданне: Для ст. шк. узросту / У. С. Караткевіч ; маст. А. А. Арынушкін. – Мінск : Юнацтва, 1992. – 256 с.**

**«Чазенія» – гэта аповесць аб рамантыцы далекіх дарог, аб сустрэчах, моцы дружбы, кахання, ветнасці.**




**К. 215 ч.з.**
**Караткевіч, У. С.**
**Чорны замак Альшанскі : раман, аповесць / У. С. Караткевіч ; мастак П. Драчоў. – Мінск : Мастацкая літ., 1983. – 359 с.**

**На працягу многіх гадоў У. Караткевіч даследуе ў разнастайных пластах гісторыі народнага жыцця вытокі гераічнага. У гістарычным рамане-дэтэктыве «Чорны замак Альшанскі» пісьменнік уваскрашае падзеі, якія адбываюцца ў далёкім мінулым. Гэтыя падзеі гістарычна і сюжэтна звязаны с сучаснасцю.**




**08(47.60)**
**К 215 з.п.**
**Караткевіч, У. С.**
**Зямля пад белымі крыламі : нарыс / У. Караткевіч. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1977. – 176 с.**

**Гэта кніга пра Беларусь – своеасаблівае эсэ-даследванне. Размова ў ёй ідзе пра прыроду рэспублікі, фаўну і флору, фальклор і этнаграфію, пра сівую мінуўшчыну і сенняшні дзень.**




**9(47.60)**
**К 215 м.**
**Караткевіч, У. С.**
**Мсціслаў. ЭСЭ пра гісторыю і людзей адной зямлі / У. С. Караткевіч. – Мінск : Беларусь, 1985. – 140 с.**

**Папулярны нарыс аб адным са старажытнейшых гарадоў Беларусі – Мсціславе, раенным цэнтры Магілеўскай вобласці.**



# «ЛІТАРАТУРНАЯ СПАДЧЫНА УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА»

**(Віртуальную выставу падрыхтавала бібліятэкар 2-й катэгорыі  Лапцева Л.Д.)**

